Ба 40765

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР ІМЯ В. І. ЛЕНІНА

# АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

МІНСК 1954

А 40765 бр

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР ІМЯ В. І. ЛЕНІНА
АДДЗЕЛ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І БІБЛІЯГРАФІІ

*Пісьменнікі БССР*
Серыя памятак чытача

# АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ

Бібліяграфічная памятка чытача

Бел. аддзел 1994 г.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

МІНСК 1954

Серыя бібліяграфічных памятак «Пісьменнікі БССР» разлічана на шырокія колы чытачоў і на бібліятэкараў масавых бібліятэк. Памяткі ставяць сваёю мэтай дапамагчы бібліятэкарам у іх даведачна-бібліяграфічнай рабоце, звязанай з прапагандай твораў беларускіх пісьменнікаў.

Памятка, прысвечаная двойчы лаўрэату Сталінскай прэміі Аркадзю Куляшову, змяшчае тэкст пастаноў СНК СССР (1946 г.) і Совета Міністраў СССР (1949 г.) аб прысуджэнні яму Сталінскіх прэмій, асноўныя даты жыцця і творчасці паэта, спіс найбольш новых выданняў яго твораў і кароткі спіс крытычных артыкулаў аб творчасці Аркадзя Куляшова.



# АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ

## АБ ПРЫСУДЖЭННІ СТАЛІНСКІХ ПРЭМІЙ ЗА ВЫДАТНЫЯ РАБОТЫ Ў ГАЛІНЕ МАСТАЦТВА І ЛІТАРАТУРЫ ЗА 1943—1944 гг.

### *ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР*

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе: прысудзіць Сталінскія прэміі за выдатныя работы 1943 і 1944 г г. у галіне:

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

**К. Паэзіі**

Прэміі першай ступені ў размеры 100 000 рублёў.

1. **КУЛЯШОВУ Аркадзю Аляксандравічу** — за паэму «Сцяг брыгады».

Газ. «Правда» за 27/I-1946 г.

## АБ ПРЫСУДЖЭННІ СТАЛІНСКІХ ПРЭМІЙ ЗА ВЫДАТНЫЯ РАБОТЫ Ў ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ЗА 1948 г.

### *ПАСТАНОВА СОВЕТА МІНІСТРАЎ СССР*

Совет Міністраў Саюза ССР пастанавіў прысудзіць Сталінскія прэміі за выдатныя работы 1948 года ў галіне:

. . . . . . . . . . . . . . . . .

**Б. Паэзіі:**

Прэміі другой ступені ў размеры 50 000 рублёў.

. . . . . . . . . . . . . . . . .

5. **КУЛЯШОВУ Аркадзю Аляксандравічу** за паэму «Новае рэчышча».

Газ. «Правда» за 10/IV-1954 г.

«Хутка будуць называцца — знаю гэта
Комуністамі ўсе людзі на зямлі».

*Аркадзь Куляшоў* [1]

## АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ А. КУЛЯШОВА

1914 6-га лютага 1914 г. у мястэчку Самацеевічы, Касцюковіцкага р-на, Магілёўскай вобласці, у сям'і настаўніка нарадзіўся Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў.

1926 Дванаццацігадовым хлопчыкам Аркадзь Куляшоў піша свой першы верш **«Ты мой брат»**, апублікованы ў Клімавіцкай газеце «Наш працаўнік».

1928 Вершы юнага паэта друкуюцца на старонках рэспубліканскіх газет.

1930 Выходзіць першая кніга вершаў маладога паэта **«Росквіт зямлі»** (Мінск, БДВ, 1930).

1931 Аркадзь Куляшоў скончыў Мсціслаўскі педтэхнікум і паступіў у Мінскі педагагічны інстытут.

Напісана першая паэма Аркадзя Куляшова аб імперыялістычнай вайне 1914 года і Кастрыч-

---

[1]) А. Куляшоў. Комуністы. Кніга паэзіі. Мінск, ДВБ, 1951, стар. 9.

ніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі **«Крыўда».** (Пачата аўтарам яшчэ ў 1930 г.)

1932 Выходзяць дзве кнігі вершаў паэта **«Па песню, па сонца»** (Мінск, ДВБ, 1932) і **«Медзі дождж»** (Мінск, ДВБ, 1932).

1933 Напісана і выдана паэма А. Куляшова **«Аманал»** (Мінск, ДВБ, 1933) аб барацьбе совецкіх людзей супроць класавых ворагаў.

1934 Аркадзь Аляксандравіч прынят у члены Саюза Совецкіх пісьменнікаў БССР і з гэтага часу цалкам прысвячае сябе творчай працы.

У 1932 — 1934 г г. працуе ён над паэмай «Гарбун» на тэму класавай барацьбы ў вёсцы аднаўленчага перыяду. (Пазнейшая назва паэмы **«Антон Шандабыла».**)

1935 Выдана асобным выданнем паэма А. Куляшова **«Гарбун»** (Мінск, ДВБ, 1935).

1936 Паэт перакладае на беларускую мову паэму А. С. Пушкіна **«Цыганы»**.

1937 Аркадзь Куляшоў стварае паэму аб мужных совецкіх патрыётах воінах-пагранічніках **«Баранаў Васіль».** Дзяржаўным выдавецтвам БССР выдана паэма А. С. Пушкіна **«Цыганы»** ў перакладзе А. Куляшова на беларускую мову.

1938 Выдан зборнік вершаў А. Куляшова **«Мы жывем на граніцы»** (Мінск, ДВБ, 1938).

1939 У 1938 — 1939 гг. напісана паэма Аркадзя Куляшова **«У зялёнай дуброве»**, у якой выведзен вобраз шчаслівай совецкай дзяўчыны-калгасніцы.

1940 Выходзіць кніга паэзіі Аркадзя Куляшова **«У зялёнай дуброве»** (Мінск, ДВБ, 1940); у перакладзе на рускую мову выдаецца кніжка вершаў **«Дубрава»** (М., ГИХЛ, 1940).

Паэт піша суровую паэму **«Хлопцы апошняй вайны»** аб крывавых намерах імперыялістычных

драпежнікаў і гатоўнасці беларускага народа аддаць сваё жыццё за шчасце сваёй соцыялістычнай Радзімы.

1941 Вышлі з друку ў выданнях для дзяцей паэма А. Куляшова **«Баранаў Васіль»** (Мінск, ДВБ, 1941) і зборнік вершаў і паэм **«Добры чалавек»** (Мінск, ДВБ, 1941).

24 чэрвеня 1941 г. Аркадзь Куляшоў пакінуў Мінск. У гады Айчыннай вайны працуе ў армейскай газеце «Знамя Советов». У франтавых умовах стварае Аркадзь Куляшоў вершы і паэмы аб гераічнай барацьбе совецкага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1942 У верасні — кастрычніку 1942 г. напісана выдатная паэма Аркадзя Куляшова **«Сцяг брыгады»** аб совецкіх воінах — мужных патрыётах сваёй Радзімы і іх баявых справах у час Вялікай Айчыннай вайны. (За паэму «Сцяг брыгады» А. Куляшоў удастоен у 1946 г. Сталінскай прэміі першай ступені.)

1943 Выдана кніжка **«Сцяг брыгады»** (М., выд. ЦК КП(б)Б «Совецкая Беларусь», 1943), у якую ўвайшла аднайменная паэма і вершы, напісаныя ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Зборнік выдаецца таксама ў перакладзе на рускую мову (**«Знамя бригады».** М., Гослитиздат, 1943).

1944 Напісаны паэмы **«Прыгоды цымбал»** (аб партызанскай барацьбе беларускага народа супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў і совецкіх дзецях — удзельніках усенароднай барацьбы), і **«Дом № 24»** (аб адраджэнні жыцця беларускага народа ў сталіцы Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны).

1945 Выдана кніга вершаў і паэм Аркадзя Куляшова **«На сотай вярсце»** (Мінск, ДВБ, 1945) і паэма **«Прыгоды цымбал»** (Мінск, ДВБ, 1945).

У перакладзе на рускую мову ў серыі «Книга за книгой» выдан зборнік вершаў **«Комсомольский билет».** (М.-Л., Детгиз, 1945.)

1946 У студзені 1946 г. Аркадзю Куляшову была прысуджана Сталінская прэмія першай ступені за паэму «Сцяг брыгады». [1])

У серыі «Школьная бібліятэка» выдана кніга паэта **«Вершы»** (Мінск, ДВБ, 1946); у Маскве ў перакладзе М. Ісакоўскага на рускую мову выданы паэмы **«Знамя бригады»** (М., «Правда», 1946) і **«Цимбалы»** (М.-Л., Детгиз, 1946), а таксама зборнік паэм «Три поэмы» (М., Огиз, 1946).

1947 9-га лютага 1947 г. Аркадзь Куляшоў выбран дэпутатам Вярхоўнага Совета Беларускай ССР. [2])

Паэт перакладае на беларускую мову выдатную эпапею А. С. Пушкіна «Евгений Онегин».

Выданы кнігі Куляшова: **«Выбраныя творы»** (Мінск, ДВБ, 1947. Серыя «Выбраныя творы беларускай совецкай літаратуры 1917—1947 гг.») і **«Паэмы»** (Мінск, ДВБ, 1947). У перакладзе на рускую мову вышла кніга вершаў **«Стихотворения»** (М., Сов. писатель, 1947).

1948 Напісана паэма **«Новае рэчышча»** аб комуністычным будаўніцтве ў беларускай вёсцы. (Паэма ўдастоена ў 1949 г. Сталінскай прэміі другой ступені).

У серыі «Школьная бібліятэка» выдана кніга **«Выбраныя вершы і паэмы»** (Мінск, ДВБ, 1948 г.);

---

[1]) Гл. газ. «Правда» за 27/I-1946 г.
[2]) Гл. газ. «Звязда» № 33 за 13/II-1947 г.

таксама для дзяцей вышла паэма **«Прыгоды цымбал»** (Мінск, ДВБ, 1948).

У перакладзе на рускую мову выдана кніга вершаў Аркадзя Куляшова **«Коммунисты»**, выданая ў арыгінале толькі ў 1949 г.

1949 Да 30-годдзя БССР (1 студзеня 1949 г.) Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 снежня 1948 г. Аркадзь Куляшоў узнагароджаны ордэнам Леніна. [1]

У красавіку 1949 года паэту прысуджана Сталінская прэмія другой ступені за паэму **«Новае рэчышча»**. [2]

Напісана паэма **«Простыя людзі»** аб адзінстве інтарэсаў простых савецкіх людзей і простых людзей усяго свету.

Выдана кніга вершаў **«Комуністы»** (Мінск, ДВБ, 1949), у якую ўвайшла і паэма **«Новае рэчышча»**. Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдае **«Евгения Онегина»** А. С. Пушкіна ў перакладзе А. Куляшова на беларускую мову.

1950 Напісана паэма **«Толькі ўперад»** аб гераічнай савецкай моладзі.

1951 25 лютага 1951 г. Аркадзь Куляшоў выбран дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. [3]

На працягу года паэтам даапрацавана паэма **«Песня аб слаўным паходзе»** (напісана ў 1935 г.) аб Кастрычніцкай рэвалюцыі і падзеях грамадзянскай вайны на тэрыторыі Беларусі.

Вышлі наступныя кнігі Аркадзя Куляшова: зборнік паэтычных твораў **«К о м у н і с т ы»** (Мінск, ДВБ, 1951), дапоўнены ў параўнанні з аднаймен-

---

[1]) Гл. газ. «Звязда» № 1 за 1/I-1949 г.
[2]) Гл. газ. «Правда» за 10/IV-1949 г.
[3]) Гл. газ. «Звязда» № 44 за 28/II-1951 г.

ным выданнем 1949 г. новымі вершамі і паэмамі 1949 — 1950 гг.; паэма **«Новае рэчышча»** (Мінск, ДВБ, 1951); зборнік **«Выбраныя творы»** (Мінск, ДВБ, 1951), які адлюстроўвае ўвесь папярэдні творчы шлях паэта.

1952 У серыі бібліятэчкі «Огонька» выдана на рускай мове кніжка **«Только вперёд»** (М., «Правда», 1952), якая змяшчае вершы і аднайменную паэму.

1953 Напісана і апублікована ў часопісе «Полымя» (1953 г., № 3) аповесць у вершах **«Граніца».** Аповесць перакладзена Міхаілам Ісакоўскім на рускую мову і змешчана ў часопісе «Новый мир» № 8 за 1953 г.

1954 На Мінскай VIII абласной партыйнай канферэнцыі Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў выбран дэлегатам на XXI з'езд КП Беларусі. [1])

10 — 13 лютага 1954 г. удзельнічаў у рабоце XXI з'езда КПБ.

Выдана даапрацаваная аўтарам аповесць у вершах «Граніца» (Мінск, ДВБ, 1954).

---

[1]) Газ. «Мінская праўда» № 26 за 5/II 1954 г.

«Не выстаяць бомбе ў змаганні
З сям'ёю братэрскай, згоднай.
Што значыць яна ў параўнанні
З вялікаю сілай народнай!»

*Аркадзь Куляшоў* [1])

## КНІГІ А. КУЛЯШОВА

1. **Выбраныя творы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1951, 540 стар., 10 000 экз., 20 руб.

Найбольш поўны зборнік выбраных твораў Аркадзя Куляшова, які адлюстроўвае ўвесь творчы шлях паэта.

У першы раздзел кнігі ўваходзяць выбраныя вершы 1934 — 1950 гг.

Раздзел «Паэмы» складаюць наступныя эпічныя творы паэта 1937 — 1951 гг.: «Баранаў Васіль» (1937), «У зялёнай дуброве» (1938 — 1939), «Хлопцы апошняй вайны» (1940), «Сцяг брыгады» (1942), «Прыгоды цымбал» (1944), «Дом № 24» (1944), «Простыя людзі» (1949), «Новае рэчышча» (1948), «Толькі ўперад» (1950) і «Песня аб слаўным паходзе» (1935 — 1951).

Апошнім раздзелам змешчаны раннія творы Аркадзя Куляшова: вершы 1927 — 1934 г. г. і паэмы «Крыўда» (1930 — 1931), «Антон Шандабыла» («Гарбун», 1932 — 1934).

Уступны артыкул аб літаратурнай дзейнасці Аркадзя Куляшова напісан **М. Клімковічам.**

2. **Комуністы.** Вершы, Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1949, 119 стар., 6000 экз., 5 руб. 50 кап.

---

[1]) А. Куляшоў. «Комуністы», Мінск, ДВБ, 1949, стар. 12.

У зборнік увайшлі выбраныя вершы паэта пасляваеннага часу і ўдастоеная Сталінскай прэміі паэма «Новае рэчышча».

З даваенных твораў змешчан верш 1940 г. «Мая Бяседзь», у якім аўтар выказвае свой погляд на жыццё, на мэты і абавязкі савецкага чалавека.

**3. Комуністы.** Кніга паэзіі. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1951, 266 стар., 10 000 экз., 8 руб.

Папоўненае перавыданне папярэдняга зборніка. Кніга дапоўнена паэмамі «Толькі ўперад» (1950), «Простыя людзі» (1949), «Песня аб слаўным паходзе» (1935 — 1951 гг.) і вершамі: «Слова аб правадыру народаў», «Спяваючы гімн комуністаў», «Балада аб жывой газеце» і «Я не заўважыў...».

**4. Новае рэчышча.** Паэма. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1951, 61 стар., 4000 экз., 2 р. 75 кап.

Паэма (1948) аб комуністычным будаўніцтве ў беларускай вёсцы. Паэма ўдастоена Сталінскай прэміі 2-й ступені.

**5. Граніца.** Аповесць у вершах. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1954, 106 стар., 8000 экз., 3 руб. 35 кап. у пераплёце.

**6. Вершы і паэмы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1948, 215 стар., (Б-ка школьніка). 30 000 экз., 4 руб. 50 кап., пераплёт 50 кап.

У кнізе змешчаны выбраныя вершы 1935 — 1945 гадоў і паэмы «У зялёнай дуброве» (1938 — 1939), «Баранаў Васіль» (1937), «Сцяг брыгады» (1942), «Прыгоды цымбал» (1944) і «Дом № 24» (1944).

**7. Прыгоды цымбал.** Паэма, Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. дзіцячай літ-ры, 1948, 69 стар. з іл., 8000 экз., 1 руб. 50 кап.

Упершыню выдана ў 1945 г.

**8. Выбраныя творы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1947, 318 стар., (Выбраныя творы беларускай савецкай літаратуры 1917 — 1947). 8000 экз., 8 руб., пераплёт 1 руб. 50 кап.

У кнігу ўвайшлі выбраныя вершы 1927 — 1946 гг. і паэмы 1934 — 1946 гг. З паэм прадстаўлены наступныя: «Антон Шандабыла» («Гарбун», 1932 — 1934), «Песня аб разведчыках» (1935 — 1937), «У зялёнай дуброве» (1938 — 1939), «Хлопцы апошняй вайны» (1940) і «Сцяг брыгады» (1942).

Уступны артыкул прысвечан аналізу творчасці Аркадзя Куляшова. У канцы змешчана бібліяграфія твораў пісьменніка.

9. **Паэмы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1947, 153 стар., 8000 экз., 4 руб.

У кнізе змешчаны паэмы «Сцяг брыгады» (1942), «Прыгоды цымбал» (1944) і «Дом № 24» (1944).

10. **Вершы.** Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, рэд. дзіцяч. літ-ры, 1946, 207 стар., (Школьная б-ка), 15000 экз., 6 руб.

Выбраныя вершы 1929 — 1945 гг. аб'еднаны ў наступныя чатыры раздзелы: З кнігі «Па песню, па сонца» (1932 г.); З кнігі «Мы жывём на граніцы» (1938); З кнігі «У зялёнай дуброве» (1940); «1940 — 1945».

11. **На сотай вярсце.** Вершы і паэмы. Мінск, Дзярж. выд-ва БССР, 1945, 184 стар., 8000 экз., 17 руб.

Выбраныя вершы і паэмы 1937 — 1944 гг. З паэм змешчаны наступныя: «У зялёнай дуброве» (1938 — 1939), «Песня аб разведчыках» (1935 — 1937), «Хлопцы апошняй вайны» (1940, урывак з паэмы), «Сцяг брыгады» (1942) і «Дом № 24» (1944).

12. **Сцяг брыгады.** Паэма і вершы. М., Выд-ва ЦК КП(б)Б «Савецкая Беларусь», 1943, 79 стар., 10 000 экз., 3 руб.

«Ляці-ж ты, ляці, маё слова,
Да гораў далёкіх, краін.
За мір і за шчасце змагайцеся,
Працоўныя ўсіх краін!»

*Аркадзь Куляшоў* [1])

## ТВОРЫ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА Ў ПЕРАКЛАДЗЕ НА РУСКУЮ МОВУ

1. **Стихотворения.** Баллады. Поэмы. Перев. с белорусского. М., Гослитиздат, 1953, 376 стр., 25000 экз., 10 руб. 55 коп. в переплёте.

2. **Только вперед.** Стихи и поэмы. Перев. с белорусского. М., «Правда», 1952, 38 стр., (Б-чка «Огонек» № 40), 150000 экз., 50 коп.

3. **Коммунисты.** Стихи. Минск, Госиздат БССР, 1948, 109 стр., 4000 экз., 5 руб. 50 коп.

4. **Коммунисты.** Книга вторая. Минск, Госиздат БССР, 1950, 120 стр., 10000 экз., 3 руб. 20 коп.

5. **Избранное.** Перевод с белорусского **М. Исаковского.** М., Сов. писатель, 1948, 238 стр., (Б-ка избранных произведений советской литературы 1917 — 1947), 25000 экз., 10 руб.

6. **Стихотворения.** Перевод с белорусского **М. Исаковского.** М., Советский писатель, 1947, 128 стр., 10000 экз., 5 руб. 50 коп.

---

[1]) А. Куляшоў. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1951, стар. 127.

# КРЫТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА АБ ТВОРЧАСЦІ А. КУЛЯШОВА

**Перкін Н. С.** Аркадзь Куляшоў. Паэтычная творчасць. Мінск, выд-ва Акадэміі навук БССР, 1951, 203 стар. (Акадэмія навук БССР. Ін-т літаратуры і мастацтва), 8000 экз., 8 руб.

* * *

**Исаковский М.** «Знамя бригады». «Литературная газета» за 27/I-1946 г.

**Твардовский А.** Поэма Аркадия Кулешова («Знамя бригады»). Ж. «Знамя», 1946, № 4, стр. 167 — 182.

**Книпович Е.** Новое русло. В кн. «Новые успехи советской литературы». М., «Сов. писатель», 1949, стр. 344 — 355.

**Панчанка П.** «Комуністы» А. Куляшова. Газ. «Літаратура і мастацтва» за 12/III-1949 г.

**Андреев А.** От имени простых людей. В кн. «Оружие мира». Л., «Сов. писатель», 1951, стр. 196 — 212.

**Бур'ян Б.** Аб паэтычным майстэрстве А. Куляшова. Ж. «Полымя» 1951, № 12, стар. 104 — 122.

**Кучар А.** Аркадзь Куляшоў. У кн. **А. Кучар** — Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск, ДВБ, 1953, стар. 387 — 451.

## ЗМЕСТ

Пастановы Совета Народных Камісараў СССР 1946 г. і Совета Міністраў СССР 1949 г. аб прысуджэнні Сталінскіх прэмій (Вытрымкі) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

Асноўныя даты жыцця і творчасці А.Куляшова . . . . . . . 7

Кнігі А. Куляшова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13

Творы А. Куляшова ў перакладзе на рус. мову . . . . . . . 16

Крытычная літаратура аб творчасці А. Куляшова . . . . . . 17

Склала *Н. Ватацы*
Рэдактар *Р. Казуноў*
Тэхрэдактар *П. Сцержанаў*
Карэктар *Я. Плесанава*

Падпісана ў набор 18/VIII-1954 г. Падпісана да друку 25/IX-1954 г. АТ 04180. Тыраж 2000 экз. Папера 70×108 1/32. Аўт. арк. 0,52. Вуч.-выд. арк. 0,54. Пап. арк. 0,312. Друк. арк. 0,856. Цана 25 кап.
Зак. 585.

Друкарня імя Сталіна, Мінск, праспект імя Сталіна, 105.

Бел. аддзел
Аўтамат.

Цана 25 кап.

BU0000001446706

БССР
імені
ЛЕНІНА